Сотні прадпрыемстваў вымушаны былі перайсці на скарочаны працоўны дзень. За 1991—1994 гады ў 14 разоў узраслі страты працоўнага часу [7, с. 91]. Вялікую ўдзельную вагу ў іх займалі адпачынкі, прадастаўленыя з-за адсутнасці сыравіны, матэрыялаў, камплектуючых вырабаў.

Асабліва складана прыходзілася канверсуемым прадпрыемствам, якім у такіх цяжкіх умовах прыходзілася праводзіць перапрафіляванне. На многіх беларускіх заводах назапасілася гатовая прадукцыя, эквівалентная трох-пяцімесячнаму аб'ёму вытворчасці. Спад вытворчасці, які назіраўся з 1991 года, выклікаў скарачэнні працоўных месцаў і зніжэнне зарплаты, што змяншала, у сваю чаргу, унутраны попыт, які зноў узмацняў спад вытворчасці, што раскручвала своеасаблівую спіраль падзення.

Высокія выдаткі вытворчасці, а таксама нізкая якасць прадукцыі не дазвалялі рэспубліцы ва ўмовах, якія склаліся, павялічыць экспарт тавараў і папоўніць рэзервовыя запасы. Усе гэта, як і высокі ўзровень інфляцыі, аказалі істотнае адмоўнае ўздзеянне на ўзровень жыцця насельніцтва, а таксама на стан сацыяльнай сферы.

Падчас сацыялагічных апытанняў, якія праводзіліся ў 1992 годзе на замову ўрада, 61,3% рэспандэнтаў казалі, што існуюць ад зарплаты да зарплаты, 19,4% — амаль зводзяць канцы з канцамі, 5,8% — у пазыках, і толькі 12% адзначалі, што жывуць ў дабрабыце [10, арк. 39]. У тым жа 1992 годзе сацыялагічная служба «Экумена» даведалася, што 88% рэспандэнтаў былі не задаволены сваім харчаваннем [11, с. 2].

Ужо ў 1993 годзе на ежу беларускімі сем'ямі трацілася 49% прыбыткаў, тады як у 1990 годзе толькі 29%. Пры гэтым за дадзены перыяд знізілася ў разліку на аднаго члена сям'і ўжыванне мяса, рыбы, малочных прадуктаў, масла, гародніны [3, арк. 23]. У лютым 1994 года сярэдні заробак практычна параўняўся з мінімальным спажывецкім бюджэтам [3, арк. 23].

І гэта нягледзячы на тое, што дзяржава прыкладала значныя намаганні па захаванні былога ўзроўню жыцця. Рост цэн кампенсаваўся насельніцтву праз механізм індэксацыі грашовых прыбыткаў (дзейнічаў закон «Аб індэксацыі прыбыткаў насельніцтва з улікам інфляцыі»), а таксама перагляду тарыфнай стаўкі першага разраду і павышэння мінімальнага заробку. Толькі за восем месяцаў 1993 года мінімальны ўзровень заработнай платы павялічваўся чатыры разы [12, арк. 157].

Ва ўмовах высокай інфляцыі назіралася абясцэньванне ўкладаў у ашчадных банках і страхавых сум па доўгатэрміновых відах страхавання, што выклікала вялікую трывогу ў грамадзян. «Звяртаючыся ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, — пісаў жыхар Столінскага раёна М. Белавус, — я маю надзею, што будуць прыняты дзейсныя меры па абароне грамадзян, якія добрасумленна працавалі, атрымлівалі мізэрную зарплату і ўсе ж стараліся рабіць нейкія зберажэнні і імі карысталася дзяржава. Але ў сувязі з рэзкім павышэннем цэн гэтыя ўклады абясцэніліся …» [13, арк. 154].

Людзі патрабавалі індэксаваць уклады адпаведна павышэнню цэн. З-за інфляцыі збіраць грошы ў рублях было зусім бессэнсоўна. Усе пераводзілася або ў нямецкія маркі, або ў амерыканскія долары. Увогуле замежная валюта пачала выконваць функцыю аднаго з галоўных сродкаў накаплення. Айчынныя грошы ў сваю чаргу актыўна выкарыстоўваліся на набыццё тавараў.

У крызісным становішчы складанай задачай станавілася сацыяльная абарона ў першую чаргу малазабяспечаных пластоў насельніцтва, якія больш за ўсё пацярпелі падчас эканамічных пераўтварэнняў.



Репозиторий БарГУ

«Павышэннем цэн — пісала грамадзянка Р. Новікава — урад рэспублікі паставіў пад удар, у першую чаргу пенсіянераў, якія вынеслі на сваіх плячах калектывізацыю, індустрыялізацыю, голад у 1930-я гады, страшную вайну і пасляваенны голад і разруху. І зноў на плечы пенсіянераў лёг такі цяжар, які яны ўжо не змогуць перанесці пры такой дарагавізне асноўных прадуктаў харчавання, тавараў, лекаў…» [13, арк. 153].

Грамадзяне рэспублікі ў сваіх пісьмах да кіраўніцтва краіны заяўлялі, што рэформы найбольш балюча б'юць па сацыяльна неабароненых і вядуць да рэзкага паніжэння жыццёвага ўзроўню, росту няўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

У цяжкім стане апынулася сацыяльная інфраструктура — адукацыя, медыцына, культура. Непрэстыжнай стала навуковая дзейнасць. Толькі ў 1991 годзе з сістэмы Акадэміі навук Беларусі звольнілася 270 кандыдатаў навук, у той жа час паступіла на працу толькі 80 [14, с. 5]. За 1991—1995 гады колькасць навуковых работнікаў скарацілася ў 2,5 разы [3, арк. 98].

Нягледзячы на развіццё рынкавых інстытутаў, пэўны час у 1992—1993 гадах назіраўся дэфіцыт шэрагу тавараў (асабліва тых, цэны на якія па-ранейшаму рэгуляваліся дзяржавай). Таварныя запасы ў рознічным гандлі ў канцы 1993 года меліся толькі на 34 дні, пры нармалёвым запасе ў 64 дні [8, с. 47].

Звычайнай з'явай былі вялізныя чэргі за хлебам. З'явіліся перабоі з тытунёвымі вырабамі, цукрам. Аўтамабілістам нялёгка было дастаць паліва [15, арк. 83, 92, 119, 121, 125]. На пасяджэнні Вярхоўнага Савета дэпутат М. Грынёў выразна канстатаваў сітуацыю ў сельскай гаспадарцы: «хутка пасяўная, размовы ёсць — няма бензіну» [16, арк. 63].

Яшчэ ў 1992 годзе Беларусь апынулася ў сітуацыі недапастаўкі расійскай нафты, у выніку чаго (у параўнанні з 1990 годам) у 1993 годзе вытворчасць аўтамабільнага бензіну скарацілася на 61,6%, дызельнага паліва на — 58,8% [7, с. 155—156]. Народная гаспадарка ў 1993 годзе забяспечвалася палівам на ўзроўні 29% да узроўню мінулага года [15, арк. 72].

З-за перабояў з палівам урад быў вымушаны сваёй пастановай ад 01.10.1993 № 666 адмяніць ліцэнзаванне рэалізацыі і экспарту нафты і нафтапрадуктаў, а таксама ўстанавіць, што іх продаж на тэрыторыі рэспублікі ажыццяўляецца па вольных (дагаворных) цэнах.

Узрастала напружанасць на рынку працы. Калі ў 1991 годзе беспрацоўных налічвалася толькі 2,3 тысячы чалавек, то ў 1994 годзе іх колькасць узрасла да 101,2 тысячы (2,1% ад эканамічна актыўнага насельніцтва) [7, с. 12]. Да пачатку 1994 года колькасць беспрацоўных у 6 разоў перавышала колькасць свабодных працоўных месцаў [17, арк. 10]. У складаных умовах людзі атрымлівалі сродкі для жыцця з прысядзібных надзелаў і «чаўноцкага» гандлю.

Дачны надзел мог выратаваць цэлую сям'ю. У пачатку 1992 года толькі ў Мінску звыш 81 тысячы чалавек жадалі мець надзелы для садаводства і больш за 33 тысячы — для агародніцтва [18, арк. 38]. У 1993 годзе, па афіцыйных дадзеных, у структуры прыбыткаў калгаснікаў сродкі ад прысядзібных надзелаў займалі 46,3% (больш, чым усе астатнія крыніцы), у структуры прыбыткаў жыхароў горада — 7%, што таксама было нямала [19, с. 107—108]. За 1991—1994 гады колькасць беларусаў, якія займаліся калектыўным садаводствам, узрасла на 41,9%, калектыўным агародніцтвам — на 74,4% [7, с. 223].

Пра значнае месца «чаўноцтва» ў жыцці жыхароў Беларусі гаворыць такі факт: у 1994 годзе большую частку загрузкі рэйса з Каўнаса ў Стамбул складалі беларускія пасажыры [20, арк. 11]. У Турцыю «чаўнакі» ехалі за імпартнымі спажывецкімі таварамі. Гэтаму садзейнічаў істотны дыспарытэт цэн з блізкім замежжам. У Прыбалтыку, Польшчу, Расію спачатку ў асноўным вывозілі айчынную прадукцыю. Везлі бытавую тэхніку, іншыя гаспадарчыя тавары, а таксама некаторыя харчовыя (хлеб, малочныя прадукты), якія былі значна таннейшымі ў Беларусі. Потым з хуткім насычэннем рынкаў суседніх дзяржаў імпартнымі таварамі пачаліся адваротныя працэсы.

Першая палова 1990-х гадоў таксама характарызавалася з'яўленнем на беларускіх дарогах вялікай колькасці іншамарак, якія масава пачалі завозіць у краіну прадстаўнікі новай прафесіі — «аўтаперагоншчыкі» (за 1992—1993 гады ў Беларусь было ўвезена больш за 100 тысяч аўтамабіляў) [21, с. 4]. Для многіх «чаўноцкі» гандаль станавіўся асноўным заняткам. У 1993 годзе 20,4% сваіх прыбыткаў гараджане атрымлівалі з неафіцыйных крыніц [19, с. 107]. Адначасова «чаўнакі» выконвалі функцыю насычэння ўнутранага рынку спажывецкімі таварамі і сталі асновай для развіцця дробнага гадлевага прадпрымальніцтва.

Але ва ўладаў, якія абаранялі айчынных вытворцаў, сітуацыя з памежным перамяшчэннем тавараў выклікала занепакоенасць. У сваім пісьме кіраўніцтву краіны Баранавіцкі гарсавет адзначаў, што «вялікая частка насельніцтва, у тым ліку настаўнікі, лекары, інжынеры, дзяржаўныя служачыя заняліся гандлем. Гэта падаецца як турызм у блізкае замежжа. Штодзённа так званыя турысты вывозяць сотні тон харчовых і прамысловых тавараў. Акрамя долараў, марак, алкаголю і аўтамабіляў са сметнікаў турысты



Рэпазіторый БарДУ

нічога не завозяць. Тым часам людзей можна зразумець. Ніякіх справаздач, ніякіх падаткаў на прыбытак, ды і пагандляваць не тое, што займацца вытворчай дзейнасцю. Лёгкі прыбытак "турыстаў" нараджае сярод часткі насельніцтва зайздрасць, а як вынік на дзяржаўных прадпрыемствах пануюць абыякавасць, гультайства, крадзёж і роспач» [22, арк. 30]. Як потым успамінаў прэм'ер В. Кебіч, «дзейнасць "чаўнакоў" стала для урада сапраўдным бічом» [23, с. 238].

Для абароны ўнутранага рынку беларускім кіраўніцтвам прымаліся рашучыя загады. У межах выканання мерапрыемстваў закона «Аб часовых мерах па абароне спажывецкага рынку» на беларускім памежжы быў створаны 81 кантрольна-прапускны пункт (далей — КПП). Па стане на жнівень 1992 года за ўвесь час дзейнасці ўзгаданага закона на гэтых КПП органамі ўнутраных спраў было спынена 8,4 тысячы выпадкаў незаконнага вывазу тавараў [24, арк. 64]. Найбольшы адток назіраўся ў напрамку Прыбалтыкі. Да канца 1992 года такіх фактаў было ўжо выяўлена 12,5 тысячы [25, с. 2].

Але памежная кантрабанда мела адносіны не толькі да «чаўнакоў». У першай палове 1990-х гадоў пачасціліся выпадкі вывазу вялікімі партыямі каляровых металаў, паліўна-змазачных матэрыялаў [24, арк. 61]. Толькі за першыя дзевяць месяцаў 1992 года ў Брэсце быў прадухілены вываз 30 тон медзі, 4 тон латуні, 2 тон нікелю, 140 кілаграмаў цынку, а праз КПП «Казловічы» ў той жа год кантрабандысты спрабавалі адной партыяй пераправіць за межы рэспублікі 40,5 тоны лому медзі і 660 кілаграмаў нікелю [26, с. 9, 12]. Такая сітуацыя была шмат у чым выклікана апераджальным ростам цэн на сыравіну ў параўнанні з гатовай прадукцыяй, якая з-за невысокай якасці не карысталася на знешніх рынках такім вялікім попытам, як нафта, металы і інш.

Фінансавае становішча Беларусі ў значнай меры было ўскладнена таксама сітуацыяй у знешнеэканамічнай сферы, якая ў першыя гады рэалізацыі рэформенных мерапрыемстваў характарызавалася дысбалансам паміж экспартнымі магчымасцямі і імпартнымі патрэбамі рэспублікі. Краіна апынулася ў цяжкім стане ў знешнеэканамічных разліках. У 1993 годзе адмоўнае сальда гандлёвага балансу перавысіла 560 млн долараў ЗША [7, с. 15]. Адначасова рэзка павялічыўся попыт на замежную валюту для пашырэння імпартных закупак, для вывазу легальных і «ценявых» прыбыткаў.

Нарастала запазычанасць за пастаўкі энерганосьбітаў. Па стане на 1 красавіка 1992 года запазычанасць па аплаце за газ склала 801 млн рублёў [27, арк. 244], праз 16 месяцаў яна перавысіла 90 млрд рублёў [12, арк. 246]. Расійскае акцыянернае таварыства «Газпрам» пагражала прыпыненнем падачы газу ў Беларусь. З нафтай назіралася аналагічная сітуацыя: за яе пастаўкі па клірынгу 1 чэрвеня 1993 года доўг перад Расіяй складаў 350 млн долараў ЗША [15, арк. 72].

Трэба адзначыць, што беларускі ўрад, нягледзячы на намер расійскіх рэфарматараў хутка ўзняць цэны на энерганосьбіты, дамогся часовага мараторыя на іх падвышэнне. На пасяджэнні парламента прэм'ер В. Кебіч адзначаў, што павелічэнне цэн да ўзроўню сусветных непазбежна, у той жа час ён паведамляў, што «нам даюцца пэўныя ільготы на два гады (1992 і 1993 гады. Заўв. аўт. — ***П. Ж.***), бо Расія разумее, што мы не выцягнем і эканамічна СНД можа разваліцца» [16, арк. 54].

Але нягледзячы на ўсе спробы ўладаў адцягнуць балючы для эканомікі пераход да сусветных цэнаў, ужо 14 красавіка 1994 года даўгі за электраэнергію і прыродны газ склалі непамерныя 56 і 430 млрд расійскіх рублёў адпаведна [3, арк. 19].

Ва ўмовах павелічэння дэфіцыту плацёжнага балансу за першыя гады незалежнасці ўзрасла знешняя запазычанасць Рэспублікі Беларусь. Ужо на 1 студзеня 1994 года дзяржава ўзяла крэдытаў на суму 1,8 млрд долараў ЗША [3, арк. 183]. У сваю чаргу рост запазычанасці выклікаў бурную крытыку апазіцыі. У заяве парламенцкай фракцыі Беларускага народнага фронту (БНФ) гаварылася, што «наменклатурныя камуністы павесілі на шыю беларускага народа і будучых урадаў чыгунную гіру крэдытнай кабалы» [28, с. 1].

Ва ўмовах крызісу замежныя сродкі накіроўваліся ў першую чаргу не на развіццё краіны, а на пакрыццё дэфіцыту плацёжнага балансу (на пагашэнне запазычанасці за газ, бензін, мазут, закупку медыцынскага абсталявання). Так, крэдыт Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) быў амаль поўнасцю накіраваны на гэтыя мэты [29, арк. 37].

Крызісны стан эканомікі праяўляўся ў дрэнным функцыянаванні фінансавай і падатковай сістэмы. Каб кампенсаваць страты ад існаваўшых неплацяжоў і забяспечыць заработную плату працоўным, прадпрыемствы-пастаўшчыкі падтрымлівалі высокія цэны на тавары, якія яны выраблялі, нягледзячы на скарачэнне рэальнага плацёжаздольнага попыту і, у сваю чаргу, пераставалі плаціць контрагентам. У выніку развіваўся крызіс неплацяжоў. Галоўнымі прычынамі такой тактыкі было жаданне захаваць працоўныя калектывы і падтрымаць узровень зарплаты.

Рэпазіторый БарДУ

На 1 студзеня 1992 года неплацяжы ў народнай гаспадарцы Беларусі складалі 1,1 млрд рублёў, праз месяц яны ўзраслі ў чатыры разы, а ўжо 20 лютага перавысілі 10 млрд [30, арк. 40]. Асабліва вялікімі нястачы былі ў прамысловых гігантаў, якія раней знаходзіліся ў саюзным падначаленні, і прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу. Дзяржава была вымушана дапамагаць прадпрыемствам за кошт безрэсурснай крэдытнай эмісіі. Толькі ў 1994 годзе бюджэтныя субсідыі прадпрыемствам склалі 4% валавога ўнутранага прадукту (ВУП) [31, с. 36].

Практыка атрымання дадатковых, незапланаваных дзяржавай сродкаў адштурхоўвала таваравытворцаў ад самастойнага пошуку неабходных фінансавых рэсурсаў для вырашэння сваіх вытворчых і сацыяльных задач, нараджала ўтрыманства, не дапамагала фарміраванню рынкавых адносін. Нярэдка дапамога ішла агулам, не ўлічваючы эфектыўнасці вытворчасці. Як адзначаў дэпутат А. Сасноў, «мы пачынаем за кошт моцных паляпшаць становішча слабых… Мэта ясна — падтрымаць усіх. Ты сёння моцны, мы ў цябе аднялі, далі слабенькаму» [32, арк. 142].

Безрэсурснае крэдытаванне прывяло да зніжэння ўдзельнай вагі асабістых абаротных сродкаў у абаротных актывах прадпрыемстваў, інакш кажучы, іх «праяданню». Прыкладам можа быць становішча, якое склалася ў сістэме Белспажыўсаюза, дзе за 1992—1993 гады ўдзельная вага асабістых зваротных сродкаў у таварных запасах зменшылася з 68,5% да 10,3% [33, арк. 30]. Вялікія памеры крэдытавання выліліся ў рост запазычанасці беларускіх прадпрыемстваў, якая без уліку даўгоў за газ ужо ў пачатку красавіка 1994 г. дасягнула 1,3 трлн рублёў [17, арк. 10].

Праблемы ў крэдытна-фінансавай сістэме таксама ўключалі ў сябе такія з'явы, як «гульня на курсах валют», немэтавае выкарыстанне буйных ільготных крэдытаў, выдача крэдытаў без афармлення закладу, для пакрыцця фінансавых прарываў, безгаспадарчасці і страт [3, арк. 135].

У выніку існаваўшай палітыкі адбывалася прыхоўванне дзейсных фінансавых абаротаў, перавод значнай часткі разлікаў у «цвёрдыя» валюты. Вырас новы від прадпрымальніцтва па адабранні буйных наяўных сум з легальнага абарачэння, ішла перапампоўка капіталу за мяжу [34, арк. 58]. Па ацэнцы дзяржавы, да 30% падаткаў утойваліся і не паступалі ў бюджэт [35, арк. 170]. У 1993 годзе факты парушэння падатковага заканадаўства былі выяўлены на 60% правераных прадпрыемстваў [36, арк. 35].

У такіх умовах рос ценявы сектар. У пачатку 1994 года Інстытутам эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі было праведзена апытанне 19 буйных прадпрымальнікаў на прадмет экспертнай ацэнкі імі суадносін афіцыйна дэкларуемых і недэкларуемых прыбыткаў у прадпрымальніцтве. Па дадзеных апытання з 1990 года да пачатку 1994 года доля недэкларуемых прыбыткаў павялічылася з 15 да 70% [37, арк. 236].

Па прычыне дэстабілізацыі фінансавай сістэмы і разрыву эканамічных сувязяў у пачатку 1990-х гадоў шырокае распаўсюджанне набывае бартар. Амаль палова прадукцыі абарочвалася па бартарным аперацыям [38, арк. 52]. Нават у пачатку 1994 года бартар у структуры экспарту складаў 27% [29, арк. 46]. Распаўсюджанне бартара была звязана з крызісам неплацяжоў. Акрамя таго, пры неразвітай банкаўскай сістэме перавод грошай мог займаць тыдзень, а міжрэспубліканскія транзакцыі — яшчэ больш. Пры хуткай інфляцыі танней было аплаціць перавозку наяўным таварам у параўнанні з наяўнымі разлікамі. Для многіх фірм бартарны абмен стаў менш дарагім, чым грашовыя разлікі.

Чым больш фірм пераходзіла на бартар, тым лягчэй было пабудаваць ланцуг бартарных абменаў, і, суадносна, тым меншымі рабіліся транзакцыйныя выдаткі на адзінку прадукцыі, якая абменьвалася. У першай палове 1990-х гадоў пачаў фармавацца нават інстытут бартарных пасярэднікаў.

Ва ўмовах складанасцей з пастаўкамі рэсурсаў і разрыву сувязей кіраўніцтва Беларусі вымушана было пайсці на фактычнае ўзаконьванне бартару згодна з пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 06.02.1992 № 63 і ад 03.03.1992 № 111. Апошняя пастанова дазваляла пастаўляць прадпрыемствам тавары ў абмен на неабходныя камплектуючыя, сыравіну і матэрыялы [13, арк. 28].

Шматразовае павелічэнне бартарных аперацый адмоўна адбілася на фармаванні валютнага фонду рэспублікі. У выніку Беларусь сутыкнулася з праблемай недахопу валютных сродкаў нават на аплату лекаў і медыцынскага абсталявання, уступных узносаў у міжнародныя арганізацыі, на ўтрыманне дыпламатычных прадстаўніцтваў і пасольстваў.

**Заключэнне.** У пачатку 1990-х гадоў Беларусь апынулася ў сур'ёзным эканамічным крызісе. Праблемы, якія з'явіліся ў беларускай эканоміцы, былі падобныя на праблемы іншых рэспублік былога Савецкага Саюза. Падзенне ВУП, цяжкасці ў забеспячэнні, абвал вытворчасці, крызіс неплацяжоў, страта рынкаў экспарту, пагаршэнне ўмоў гандлю, інфляцыя, якая перавышала ўсе дапушчальныя межы,

Рэпазіторый БарДУ

вялікая запазычанасць, пагаршэнне харчовага і сацыяльнага забеспячэння насельніцтва сталі рэальнасцю для Беларусі ў першыя гады яе незалежнасці.

Склалася цяжкая сітуацыя з інвестыцыямі, якія значна скараціліся. Інфляцыя расла як інфляцыя попыту, калі дзяржава раздавала грошы без уліку сваіх магчымасцей, крэдытавала эканоміку, павышала сацыяльныя выплаты. Пры значна меншым аб'ёме тавараў у краіне назіралася вялікая грашовая маса, пастаяннае пашырэнне якой (за кошт безрэсурснай эмісіі і яе цэнтралізаванага размеркавання па адмоўнай працэнтнай стаўцы на падтрымку суб'ектаў гаспадарання) істотна ўскладніла фінансавае становішча. У сувязі з абвастрэннем праблем паставак, збыту прадукцыі, скарачэння інвестыцыйных праграм знізілася і кіравальнасць эканамічнымі працэсамі, што таксама пагоршыла сацыяльна-эканамічны крызіс у рэспубліцы.

Высокі ўзровень інфляцыі прывёў да абясцэньвання прыбыткаў і зберажэнняў. Дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту, а таксама рэзкі рост коштаў ускладнілі становішча ў сацыяльнай сферы, адукацыі, навуцы, культуры і ахове здароўя. Мільёны людзей апынуліся за рысай беднасці. Многія, не чакаючы дапамогі ад дзяржавы, вымушаны былі ратавацца самі за кошт сваёй прыватнай ініцыятывы, займаючыся дробным гандлем або развіваючы свае прысядзібныя гаспадаркі.

Назіраліся перакосы ў развіцці прыватнага сектару, які сыходзіў у цень, дзе пашыраліся магчымасці для яго крыміналізацыі і ўзмацнення карупцыі. Выразнай выявілася неэфектыўнасць знешнеэканамічнай стратэгіі, якая стварыла масу неабгрунтаваных перашкод для павелічэння экспарту і назапашвання як «цвёрдай», так і «мяккай» валюты. У знешнім гандлі пануючым стаў бартар. Беларусь страціла традыцыйныя рынкі, а рэальныя кошты на крытычна важныя імпартныя тавары, асабліва на энерганосьбіты, рэзка ўзраслі.

Такім чынам, крызіс пачатку 1990-х гадоў не быў класічным эканамічным крызісам, характэрным для рынкавай эканомікі, ён меў асаблівы характар і быў звязаны з дэградацыяй, разбурэннем старой адміністрацыйна-каманднай сістэмы, часткова памылкамі ў ажыццяўленні пераўтварэнняў, а таксама рэструктурызацыяй эканомікі, рэформамі, якія ажыццяўляліся ў краіне, бо менавіта імплементацыя рынкавых адносін у гаспадарку, якая развіваецца на зусім іншай, не рынкавай аснове, відавочна прыводзіць да сур'ёзных эканамічных дыспрапорцый. Першапачаткова крызіс развіваўся як структурны і выражаўся ў неадпаведнасці састарэлых механізмаў савецкай эканамічнай палітыкі новым умовам гаспадарчай дзейнасці, якія з'явіліся ў выніку рэфармавання эканомікі. Але ў далейшым крызіс набыў больш шырокія маштабы, і трэба разумець яго ўжо як трансфармацыйны, бо ён ахапіў усе сферы сацыяльна-эканамічнага жыцця Беларусі і стаў адваротным і непазбежным бокам змены яе сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця.

**Спіс цытаванных крыніц**


1. *Прокофьева, Н.* Инфляция: враг открывает лицо / Н. Прокофьева, Т. Широкоумова // Белорус. рынок. — 1993. — № 3. — С. 2.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 83.
3. НАРБ. — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 603.
4. НАРБ. — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 1159.
5. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 1. — Спр. 3049.
6. *Антонов, Е.* Правительство спрашивает, как жить дальше / Е. Антонов // Белорус. рынок. — 1992. — № 18. — С. 1, 13.
7. Народное хозяйство Республики Беларусь, 1994 г. : стат. ежегодник. — Минск : Нац. стат. ком., 1995. — 543 с. .
8. *Мясникович, М. В.* Становление рыночной экономики в Республике Беларусь / М. В. Мясникович. — Минск : Мисанта, 1995. — 112 с.
9. НАРБ. —Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 604.
10. НАРБ. — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 83.
11. Кому обед не по карману? // Белорус. рынок. — 1992. — № 5. — С. 2.
12. НАРБ. — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 615.
13. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 12. — Спр. 121.
14. *Альбертович, С.* От хорошей жизни не бегут / С. Альбертович // Белорус. рынок. — 1992. — № 16. — С. 5.
15. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 12. — Спр. 128.
16. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 1. — Спр. 3057.
17. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 1. — Спр. 4141.
18. НАРБ. — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 38.
19. Республика Беларусь в цифрах, 1994 : крат. стат. сб. — Минск : Нац. стат. ком., 1995. — 271 с.
20. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 12. — Спр. 110.
21. *Галькевич, А.* Импорт автомобилей в 1992—1993 годах / А. Галькевич // Белорус. рынок. — 1994. — № 22. — 22—28 мая. — С. 4.


Репозиторий БарГУ

22. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 12. — Спр. 77.
23. *Кебич, В. Ф.* Искушение властью: из жизни премьер-министра / В. Кебич. — Минск : Парадокс, 2008. — 478 с.
24. НАРБ. — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 613.
25. Замки уже можно снимать? [Пресс-конференция председателя ГТК Г. Шкрудя, начальника главного управления пограничных войск Е. Бочарова, замминистра МВД К. Платонова и зампреда ГТК А. Деревяшко] // Белорус. рынок. — 1993. — № 15. — С. 2.
26. *Диско, А.* Контрабанда: хорошие времена / А. Диско // Белорус. рынок. — 1992. — № 17. — С. 9, 12.
27. НАРБ. — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 121.
28. Сегодня — кредит, завтра — крах. Заявление парламентской оппозиции БНФ // Белорус. рынок. — 1993. — № 1. — С. 1.
29. НАРБ. — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 1155.
30. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 12. — Спр. 70.
31. Transition report, 1995: investment and enterprise development: economic transition in Eastern Europe and the former Soviet Union. — London : EBRD, 1995. — 223 c.
32. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 1. — Спр. 4135.
33. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 12. — Спр. 130.
34. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 12. — Спр. 79.
35. НАРБ. — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 1150.
36. НАРБ. — Ф. 7. — Воп.12. — Спр. 1161.
37. НАРБ. — Ф. 7. — Воп. 12. — Спр. 1162.
38. НАРБ. — Ф. 968. — Воп. 1. — Спр. 3048.

Паступіў у рэдакцыю 06.03.2017

Репозиторий БарГУ